# СВЯТКАВАЛІ ЎСЕЙ КРАІНАЙ

## НАВАГОДНІ НАСТРОЙ БЕЛАРУСІ




Фота БелТА і Сяргея ПЯТРОВА.

## Надвор'е на заўтра

| Горад | Ціск | Ноччу | Днём |
|---|---|---|---|
| МІНСК | 757 мм рт.сл. | -4..-2°C | -4..-2°C |
| ВІЦЕБСК | 757 мм рт.сл. | -6..-4°C | -6..-5°C |
| МАГІЛЁЎ | 756 мм рт.сл. | -4..-2°C | -4..-3°C |
| ГОМЕЛЬ | 758 мм рт.сл. | -2..-1°C | -2..-1°C |
| ГРОДНА | 759 мм рт.сл. | -4..-2°C | -2..-1°C |
| БРЭСТ | 762 мм рт.сл. | -3..-1°C | -2..-1°C |

Паводле даных Белгідрамета

**...у суседзяў**

МАСКВА -3..-1°C

С.-ПЕЦЯРБУРГ -7..-5°C

**Месяц**

*Маладзік 31 снежня 2024 года. Месяц у сузор'і Рыб.*

**Геамагнітныя ўзрушэнні**

22 гадз., 01 гадз., 04 гадз., 07 гадз., 10 гадз., 13 гадз., 16 гадз., 19 гадз.

Абазначэнні:
- — няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
- — невялікія геамагнітныяўзрушэнні
- — слабая геамагнітная бура
- — малая геамагнітная бура



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

НАДВОР'Е

## ДА ВЫХАДНЫХ ЗІМА ПАКАЖА СВОЙ ХАРАКТАР

**А ноччу будзе па-сапраўднаму марозна**

У снежні мы белага ды пухнатага снегу і не бачылі. Мокры снег-пяцiхвілінка і не больш за тое. А вось з першых дзён новага года зіма вырашыла паказаць нам майстар-клас: да нас у госці зазірне вецер з Арктыкі, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У першую пятніцу года надвор'е ў Беларусі будзе вызначаць халодная няўстойлівая паветраная маса. Воблачна з праясненнямі. Месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу, які будзе пераходзіць у мокры снег і снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер заходні, паўднёва-заходні ўмераны, месцамі парывісты, уначы месцамі на ўсходзе моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад нуля да мінус 6 градусаў, удзень будзе ад 2 цяпла да 3 марозу. Атмасферны ціск ноччу будзе расці, днём істотна не зменіцца.

Надвор'е пачне мяняцца ўжо ў суботу. На большай частцы тэрыторыі краіны чакаецца кароткачасовы снег. Месцамі мяцеліца, на дарогах галалёдзіца. Вецер заходні, паўночна-заходні парывісты, у многіх раёнах моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 2 градусаў да 7 марозу, днём крыху цяплей, але ўсё ж ад нуля да мінус 4 градусаў.

У нядзелю да нас прыйдзе вецер з поўначы і ўмовы надвор'я будуць фарміраваць малаактыўныя франтальныя раздзелы і паветраныя масы арктычнага паходжання. Воблачна з праясненнямі. Ноччу месцамі, днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер заходні, паўднёва-заходні парывісты. Тэмпература паветра ўначы да 2—9 марозу, ды і днём будзе ад нуля да мінус 5 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым знач-ком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 662. Індэкс 63850. Зак. № 73.

Нумар падпісаны ў 19.30 2 студзеня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12